Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 1 (510) Субота, 12 студзеня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

## ІДЗЕ ПРАВЕРКА ВЕДАЎ

(Экзаменацыйны агляд)

Задача, якую я ўзяў на сябе, вельмі складаная. Ну, уявіце сабе, як гэта можна сабраць у адно цэлае вынік работы дзесяткаў студэнцкіх калектываў — звычайных студэнцкіх акадэмічных груп. Можна было б пачаць з таго, што ў нас ва універсітэце восем факультэтаў, на кожным факультэце — па 5 курсаў, на кожным курсе — некалькі акадэмічных груп. Іх ва універсітэце амаль паўтараста. І кожная здала залікі, а цяпер здае экзамены.

Можна было б пачаць агляд з апісання чытальных залаў, у якіх цяпер месца днём з агнём не знойдзеш. У бібліятэках разабраны ўсе кнігі, якія толькі могуць спатрэбіцца ў ходзе падрыхтоўкі да экзамена. У любой аўдыторыі, у кабінеце, у студэнцкім пакоі, на калідоры цяпер можна бачыць толькі адно: студэнта, кнігу, канспект. І калі сустракаюцца хаця б двое, першае іх слова: «Ну, як?». Як здаў экзамен? як адказваў? што пытаў выкладчык? ці былі дадатковыя пытанні? І калі сябра канчае расказваць аб экзамене, яго субяседнік заключае размову: «Маладзец!».

Можна было б пачаць агляд хаця б з таго, як па добрай студэнцкай традыцыі, нібы праважаючы на ратны подзвіг, сябры жадаюць «ні пуху, ні пяра» свайму аднакурсніку, які рашучай рукой адчыняе дзверы і ўваходзіць у аўдыторыю. Давайце і мы ўвойдзем разам з ім. Куды? Ну, напрыклад, у аўдыторыю, дзе здаюць гісторыю сярэдніх вякоў студэнты 2 групы 2 курса гістарычнага факультэта. Гэта — першы экзамен зімовай сесіі на факультэце. Кідаецца ў вочы нязвычная абстаноўка: на стале перад выкладчыцай Нінай Антонаўнай Гусаковай толькі дзве паперкі — экзаменацыйная ведамасць і праграма курса гісторыі сярэдніх вякоў. Няма традыцыйных білетаў, ёсць спакойная дзелавая размова выкладчыка і студэнта. Некалькі мінут роздуму,. і Леанід Шохан пачынае свой адказ на пытанне аб абразаванні гарадоў у сярэднія вякі. У добрам адказе студэнта сустракаюцца, праўда, нязначныя памылкі, але не аказваюць рашаючага ўплыву на ход адказу. Выкладчыца ўважліва выпраўляе памылку студэнта, і далей пытанне асвятляецца бездакорна. На дадатковыя пытанні Леанід таксама адказвае упэўнена і правільна. У выніку — «выдатна» і подпіс экзаменатара ўпрыгожваюць заліковую кніжку студэнта. Выдатны пачатак сесіі на гістфаку!

Выдатна здаюць сесію трэцякурснікі хімічнага факультэта (3 група). Яны здалі ўжо два экзамены: крышталахімію — Мікалаю Георгіевічу Рафальскаму і палітычную эканомію—Сцяпану Яфімавічу Янчанку. Абодва экзаменатары засталіся задаволены групай. Ды і група — імі. Патрабавальная выкладчыкі знайшлі магчымым толькі па пары троек паставіць па кожнаму экзамену. Астатнія — выдатныя і добрыя адзнакі. Дарэчы, гэтая група ўжо добра вядома чытачу. Мы расказвалі аб добрай вучобе яе студэнтаў і раней. Расказвалі таксама аб іх паездцы на работу ў час летніх канікул у Крымскую вобласць.

Усебакова праверыў веды курса тэхнікі афармлення газеты выкладчык Анатолій Вікенцьевіч Балаш. Другакурснікі аддзялення журналістыкі ўпартай працай заваёвалі права на атрыманне станоўчай адзнакі. Галоўны вынік экзамена — ніводнага невуда, добрыя веды. Будзем спадзявацца, што другакурснікам не раз яшчэ прыдзецца дэманстраваць сваё ўменне вярстаць газету.

Разам з нашымі студэнтамі здаюць экзамены і в'етнамскія і кубінскія юнакі і дзяўчаты. Яшчэ ў заліковцы многіх з іх не было ніводнай адзнакі. Аднак па тым, як на практычных занятках адказваюць Хуста Рэвела і Карлас Альварэс (студэнты першага курса фізічнага факультэта), як яны растлумачваюць сваім сябрам незразумелыя пытанні, можна было з упэўненасцю сказаць аб тым, што сесію яны здадуць паспяхова. Цяжка каго-небудзь выдзеліць з пяцёркі кубінскіх студэнтаў, якія навучаюцца на першым курсе хімічнага факультэта.

9 студзеня здавалі свой першы экзамен 46 в'етнамскіх студэнтаў першага курса фізічнага факультэта. Адна група здавала аналітычную геаметрыю, другая — матэматычны аналіз. У абедзвух групах пераважную большасць склалі выдатныя і добрыя адзнакі.

Лепш за ўсё аб выніках экзаменаў можна было б даведавацца з бюлетэняў, падобных на той, які выпускае фізічны факультэт. Але на многіх факультэтах з году ў год паўтараюць старыя памылкі. Як бачна, экзаменацыйнай інфармацыі яшчэ цяжка прабіць дарогу ў жыццё. А дарэмна. Гэта вельмі добры сродак запаліць сапраўдны агонь студэнцкага энтузіязма і таварыскага спаборніцтва ў час экзаменаў.

В. НАЛІМАЎ.

## САВЕЦКІ САЮЗ БЫЎ І ЗАСТАЕЦЦА З РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ КУБАЙ

### *Урачысты сход у Крамлёўскім тэатры*

— Масквічы, як і ўсе савецкія людзі, захапляюцца мужнасцю і працавітасцю слаўнага кубінскага народа. І сёння, у радаснае свята гадавіны кубінскай рэвалюцыі, ад усяго сэрца жадаюць сваім кубінскім братам новых вялікіх поспехаў у барацьбе за свабоду і незалежнасць сваёй радзімы, за перамогу сацыялізма, — сказаў, адкрываючы 3 студзеня ўрачысты сход прадстаўнікоў працоўных і грамадскасці сталіцы, прысвечаны чатырохгоддзю кубінскай рэвалюцыі, першы сакратар МГК КПСС Н. Г. Ягорычаў.

— Савецкія людзі, — падкрэсліў ён, — аднадушна падтрымліваюць заяву таварыша М. С. Хрушчова аб тым, што Савецкі Саюз быў і застаецца з рэвалюцыйнай Кубай, што мы і ў далейшым будзем дапамагаць кубінскаму народу будаваць новае грамадства, узводзіць цудоўны будынак сацыялізма, поўны святла, шчасця і цяпла.

Даклад аб слаўнай гадавіне зрабіў старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў СССР па культурных сувязях з зарубежнымі краінамі С. К. Раманоўскі.

Выступіўшыя затым на сходзе першы лётчык-касманаўт, Герой Савецкага Саюза Ю. А. Гагарын і ткачыха камбіната «Трохгорнай мануфактуры», член брыгады камуністычнай працы Галіна Арцішэўская расказалі аб сваіх паездках на Кубу.

З вялікай прамовай на сходзе выступіў пасол Кубінскай Рэспублікі ў СССР Карлас Аліварэс Санчэс.

Урачысты сход прадстаўнікоў працоўных і грамадскасці сталіцы закончыўся вялікім канцэртам, у якім выконваліся народныя песні і танцы рэвалюцыйнай Кубы. (ТАСС).

★

У Мінску, у памяшканні Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя Горкага, 4 студзеня адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны савецка-кубінскай дружбе.

З дакладам аб 4-й гадавіне перамогі кубінскай рэвалюцыі выступіў першы сакратар ЦК ЛКСМБ Л. Г. Максімаў.

У заключэнне вечара быў паказаны спектакль «Дзень нараджэння Тэрэзы».

## *Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР*

### АБ ПРАВЯДЗЕННІ ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ САВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ССР І Ў АБЛАСНЫЯ, РАЁННЫЯ, ГАРАДСКІЯ, СЕЛЬСКІЯ І ПАСЯЛКОВЫЯ САВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ БЕЛАРУСКАЙ ССР

**У сувязі з заканчэннем 1 сакавіка 1963 года паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Беларускай ССР пятага склікання і 19 сакавіка 1963 года — паўнамоцтваў абласных, раённых, гарадскіх, сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў працоўных Беларускай ССР восьмага склікання Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

**назначыць выбары ў Вярхоўны Савет Беларускай ССР і ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных Беларускай ССР на нядзелю 3 сакавіка 1963 года.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
В. КАЗЛОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Д. ЛУКАШЭВІЧ.

5 студзеня 1963 года.
гор. Мінск.

## *Навагоднія віншаванні*

Да навагодняга свята ў адрас нашага універсітэта паступілі шматлікія віншаванні ад нашых сяброў з розных гарадоў краіны і з-за рубяжа.

Вось што пішуць супрацоўнікі універсітэта, якія працуюць цяпер выкладчыкамі на Кубе: «Віншуем увесь калектыў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна з надыходзячым Новым 1963 годам! Шлём усім работнікам універсітэта сардэчнае прывітанне з радзімы Хасэ Марці і Фідэля Кастра! Прыміце нашы найлепшыя навагоднія пажаданні! Няхай жыве мір ва ўсім свеце!

Ольга і Рэм Вадэйка»

«Віншуем Вас і ўвесь прафесарска-выкладчыцкі склад з Новым годам. Мы вельмі дзякуем вам усім за тое, што вы дапамаглі нашым дзецям Уго і Аліне Марцінэс і іншым кубінскім стыпендыятам атрымаць веды, якія так патрэбны для пабудовы новага, сацыялістычнага грамадства на Кубе, свабоднай тэрыторыі Амерыкі.

Мы ўпэўнены, што нашы жаданні ажыццявіцца, у прыватнасці таму, што мы адчуваем вашу дапамогу і дапамогу і салідарнасць вашага вялікага і дружалюбнага народа.

Жадаем вам шмат шчасця; вялікае Вам дзякуй!» — такое пісьмо прыслалі на імя рэктара універсітэта А. Н. Сеўчанкі кубінскія грамадзяне Адэльмо Марцінэс і Ілюмінада Вальдэс.

Віншаванні ў гонар навагодняга свята прыслалі таксама:

Міністр вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР М. В. Дарашэвіч,

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па справах архітэктуры і будаўніцтва БССР У. А. Кароль

Пасольства Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам у СССР,

Люблінскі універсітэт імя Марыі Кюры-Складоўскай (Польшча),

Дэбрэцэнскі універсітэт імя Кошута (Венгрыя),

бібліятэка Растокскага універсітэта (ГДР),

Далёкаўсходні дзяржаўны універсітэт,

Петразаводскі дзяржаўны універсітэт,

Самаркандскі дзяржаўны універсітэт,

Тартускі дзяржаўны універсітэт,

Чарнавіцкі дзяржаўны універсітэт,

калектыў навуковай бібліятэкі Латвійскага дзяржаўнага універсітэта імя П. Стучкі,

Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі,

Беларускі інстытут народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава,

Беларускі тэхналагічны інстытут імя С. М. Кірава,

Гродзенскі педагагічны інстытут імя Янкі Купалы,

Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага.

Шматлікія навагоднія віншаванні атрымалі таксама многія кафедры, факультэты, грамадскія арганізацыі, бібліятэка нашага універсітэта.

Ад імя ўсяго калектыву Белдзяржуніверсітэта рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» шчыра дзякуе ўсім нашым сябрам, якія прыслалі віншаванні да навагодняга свята.

## Чарговы нумар „Журналіста"

Выйшаў чарговы нумар вучэбнай газеты «Журналіст», прысвечаны вытворчай практыцы студэнтаў аддзялення журналістыкі. У наступным нумары мы апублікуем агляд гэтай газеты.

## Пісьмы ў рэдакцыю

# А ці можа так далей быць?

ЦЯЖКА ўстанавіць цяпер, хто першым назваў журналістаў самым датошным народам. Ім, маўляў, усё трэба ведаць, усюды сунуць свой нос. Заўсёды турбуюць людзей, перашкаджаюць ім спакойна працаваць. Дапамагчы б, выказаць сваю прапанову, даць параду... Або, скажам, прыдзі ў кабінет да начальства, выкладзі ўсё па пунктах, па парадачку, чыста, гладка, на машынцы... Яно адразу глядзіцца ў самы корань. І на душы прыемней... Дык не, таго і глядзі — у газету, ды абвядуць яшчэ рамкай, ды загаловак улепяць, як бомбу, і подпісы знойдуцца пад такі матэрыял. Гэта—нядобра. Не па-чалавечаму. Чаго б працэй... цішэй... сціпла як-небудзь...

Але мы—студэнты. Многага нават з жыцця універсітэта яшчэ не ведаем. Не ведаем мы і таго, чаму ў корпусе па Чырвонаармейскай няма свабодных аўдыторый для заняткаў па замежнай мове. Але цяжкасці параджаюць і сродкі выхаду з палажэння. Імі аказваюцца кабінеты моваў і літаратур. У вячэрнюю змену і не спрабуйце займацца там. На дзвярах напярэджанне: «Занята. 2 курс. Англічане».

У дэканат скардзіцца? Там таксама скардзяцца... у рэктарат. Папрасіць, каб асвабадзілі кабінет? Так там жа лекцыя! І яны ўправе сказаць: не мы адні такія.

Нават прадстаўнікі Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі не палічыліся са студэнтамі. Прыйшлі, сказалі: мы гаспадары, мы і распараджаемся. І распарадзіліся... заняць аўдыторыю № 1. Курс займаецца ў кабінеце дзве гадзіны. Адзаймаліся, і ключ адразу ж вахцёру здаём. А «вярхі» не з тых—ключ ад аўдыторыі пад сям'ю замкамі схавалі.

Ці вось, скажам, якая справа 600 студэнтам, якія займаюцца ў адну змену, выбачайце за выраз, да туалетаў? Сказана — і адгарадзілі іх... друкарні выдавецтва МВСС і ПА БССР.

— А што яшчэ будуць гарадзіць? — спытаеце вы. — Хто ведае!

— В нашей жизни всякое бывает...,— напяваюць студэнты-журналісты, накіроўваючыся да кабінета друку. На дзвярах — паперка: «Асцярожна! Вам пагражае небяспека. Можа рушыцца столь». Але падыйшоўшыя рэагуюць па-свойму: «І ў наш час жартаўнікі не перавяліся!». Аднак толькі пераступілі парог, як раптам над галавой— «Ух!» — са столі пасыпаліся кавалачкі тынкоўкі. Гэта значыць, паверхам вышэй ідуць заняткі цяжкаатлетаў. Так, тут не да жартаў. А вось АКБ універсітэта, напэўна, жартуе з аварыйным станам памяшкання.

Калі навічок спрабуе знайсці аўдыторыю машынапісу, яму ахвотна растлумачваюць: «.., на другім паверху шукайце дзвер з вялікай дыркай».

Тут ужо сіл не згубіш. Адразу табе кідаецца ў вочы... дырка разам з дзвярыма.

Студэнтаў, бачыўшых віды за гэтымі дзвярыма, не правядзеш. Дзверы яшчэ на замку, а ў руках у многіх і скрынкі ад сталоў, і дошкі, і сядзенні ад крэслаў, і кнігі, карацей кажучы, што пад рукі трапіць. Зразумела, не ўсе ў падвал за утылем ходзяць. Футаляры ад машынак «Зеніт» не горш скрыняў па трываласці. На іх і садзяцца. А без зручнасцей — ні «а», ні «б», не навучышся друкаваць.

За сталом — па два-тры чалавекі. Каpэткі ад машынак «Масква» ці «Ленінград», рухаючыся з візгам, чапляюцца адна за адну. Выкладчыца вымушана сядзець на адзіным у пакоі падваконніку. Абы як прыстасаваўшыся, студэнты пераходзяць да другой праблемы — дзе знайсці паперы для друкавання? І ў ход ідуць канспекты, сшыткі, недапісаныя старонкі...

Калі паўгадзінным пошукам надыходзіць канец, па ўсіх паверхах з нарастаючым тэмпам узнімаецца шум, нібы дзесьці абмалачваюць хлеб цапамі. Студэнтам-юрыстам, што за сценкай, спакой патрэбен (ды ці толькі ім!) і яны пакутліва ўздыхаюць: «Зноў журналісты друкаваць вучацца».

...Уздоўж сцяны — чарга. Студэнты цікавяцца: «Хто апошні?» і становяцца ў чаргу. Дзвер зачынена. Праходзіць 5, 10, 15 мінут.

— Чаму так доўга не прыходзіць? — пытаюць у чарзе.

— Хто?

— Ды яна, буфетчыца...

— Што вы! Буфет у канцы калідора, а тут фоталабараторыя журналістаў. Пяць чалавек увайшлі, астатнія 25 — у чарзе.

— За што гэта вас так? — здзівіліся, выходзячы з чаргі, юрысты.

Вы, напэўна, думаеце, што на палачках і пальцах можна вучыць толькі першакласнікаў. Але... На што ўжо журналісты далёкія ад першакласнікаў, але і іх вучаць лічыць на палачках з прымяненнем уласцівай кожнаму фантазіі. Як?

А вось так: (загінаем палец) няма спецыяльнага абсталявання па газетнай тэхніцы; няма (загінаем другі палец) памяшкання; няма (загінаем трэці) у дастатковай колькасці апаратуры для здымкі і запісу, няма... няма... Пераходзім на палачкі.

Да гэтага часу няма кабінета газетнай тэхнікі, абсталяванага і афармленага нагляднымі дапаможнікамі. Вось і карыстаюцца на занятках пальцамі і палачкамі... Смешна? Каму як!

Над сталом вахцёра— сігнальны гадзіннік. Але... калі-некалі і «заесць» уключаны механізм (шкада толькі, што адлегласць не дазваляе данесці да галоўнага корпуса свае сігналы-скаргі на электрыкаў). Толькі рашучае умяшацельства вахцёра выратоўвае становішча. Усё вельмі проста. Ён падстаўляе стул, узлязае і з усёй сілы б'е курсавымі журналамі па корпусу гадзінніка. Прыслухаецца — сігналяць. «Спецыяліст» не вытрымлівае — і бах! шчоткай палавой. Сталі. На двое сутак. А сёмага снежня звон не спыняўся больш васьмі мінут. Нейкі студэнт прапанаваў вахцёру... малаток.

Але расказанае — далёка не ўсё з непарадкаў у корпусе на Чырвонаармейскай. Так што — судзіце самі, дарагія чытачы.

**Па даручэнню студэнтаў 2 курса вячэрняга аддзялення журналістыкі**
**Георгій ОГІЙ.**

## Давесці справу да канца

На першы погляд у інтэрнаце № 2 па вул. Бабруйскай—чысціня і парадак. Напярэдадні Новага года камісія мясцкома наведала інтэрнат і дала станоўчую ацэнку капітальнаму рамонту, які праводзіўся ў 1962 годзе. Нават была выказана думка, што цяпер інтэрнат стаў лепшым ва універсітэце.

Аднак паглядзім, што ёсць у сапраўднасці. Тое, што ў інтэрнаце чыста, наведзен парадак у дзяжурстве, не выклікае ніякага сумнення. А наконт рамонта трэба зрабіць сур'ёзную папраўку.

У час рамонту не былі пастаўлены ўсе водаразборныя краны. Гэта прыйшлося рабіць самому каменданту А. Я. Гарачавай і сантэхніку У. Ф. Клімаву. Шмат недаробак было пакінута ў санвузлах. На першым паверсе ёсць пакой, дзе вісіць назва «умывальнік», аднак ніводнага умывальніка ў гэтым пакоі няма. На чацвёрты паверх зусім не паступае вада, і жыхарам гэтага «райскага» паверху прыходзіцца насіць ваду з ніжэйшых паверхаў, каб зрабіць уборку ў пакоях і на калідоры. Можна прывесці яшчэ цэлы шэраг недахопаў.

Ва ўсіх гэтых недаробках вінаватыя галоўны інжынер універсітэта У. А. Харэвіч, які ўзначальваў капітальны рамонт, і інжынер У. Ф. Гапонаў, якому было даручана адрамантаваць санвузлы і водаразборную сістэму. Здзіўляе таксама, што камісія не знайшла гэтых недахопаў. Пэўна, не ведаюць аб іх кіраўнікі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі.

Але давесці справу да канца неабходна і мірыцца са стварыўшымся становішчам далей нельга.

**Члены студсавета.**

# АБ РАБОЦЕ БІБЛІЯТЭКІ

Яшчэ зусім нядаўна наша бібліятэка размяшчалася ў біялагічным корпусе. Цесна было чытачам, бібліятэкарам. Неверагодна цесна было і кніжнаму фонду.

Цяпер замест былых 800 квадратных метраў бібліятэка атрымала ў новым корпусе 1700 квадратных метраў плошчы. Замест адной чытальнай залы на 150 месц — чатыры чытальныя залы на 400 месц. Двух'ярусная кнігасховішча, якое абсталявана металічнымі стэлажамі, разлічана на паўмільёна тамоў. Дамовы абанемент і чытальныя залы маюць свае добра абсталяваныя сховішчы на 100—120 тысяч тамоў.

Фонды бібліятэкі фарміраваліся працяглы час і на 1 студзеня 1963 года налічвалі каля 670 тысяч тамоў. Бібліятэка сістэматычна папаўняецца літаратурай адпаведна вывучаемым ва універсітэце навукам.

Бібліятэчныя работнікі аддзела абслугоўвання імкнуцца дасягнуць максімальнай аператыўнасці ў рабоце. Бібліятэка ўвяла адкрыты доступ да перыядычных выданняў у навуковай чытальнай зале, часткова—да дапаможных фондаў студэнцкіх чытальных залаў і дамовага абанемента.

У нашай бібліятэцы прымяняюцца розныя формы прапаганды літаратуры. Тут маюцца пастаянныя кніжна-ілюстратыўныя выстаўкі, на якіх экспануюцца новыя паступленні літаратуры, літаратура, якая прапагандуе рашэнні партыі і ўрада, выстаўкі да знамянальных і юбілейных дат.

Прапагандзе кнігі садзейнічаюць і іншыя мерапрыемствы. Гэта — канферэнцыі чытачоў, літаратурныя вечары, дыспуты па асобных кнігах і праблемах, выданне інфармацыйнага бюлетэня новых паступленняў і г. д. Неабходна, аднак, сказаць, што ў рабоце бібліятэкі мала прымяняецца такая форма прапаганды літаратуры, як агляды літаратуры.

Вялікае месца ў дзейнасці бібліятэкі займае даведачна-бібліяграфічная работа. Бібліяграфічны аддзел мае сістэматычны і алфавітны каталогі, картатэкі, дапаможныя фонды даведачна-бібліяграфічнай літаратуры, якія прадстаўляюць вялікую базу для задавальнення ўсё ўзрастаючых запатрабаванняў навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў.

У бягучым навучальным годзе загадам Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР на ўсіх факультэтах універсітэта ўведзены заняткі па бібліятэчна-бібліяграфічнаму мінімуму. Гэтую работу ўзначаліў даведачна-бібліяграфічны аддзел бібліятэкі. Толькі на першых курсах праведзена 170 акадэмічных гадзін заняткаў.

У рабоце бібліятэкі сур'ёзную дапамогу аказваюць бібліятэчны савет і актыў чытачоў.

Аднак нармальнай рабоце бібліятэкі да гэтага часу перашкаджае то, што асноўны кніжны фонд знаходзіцца яшчэ ў біялагічным корпусе. Недаравальна доўга зацягнуліся работы па заканчэнню абсталявання кнігасховішча ў галоўным корпусе.

Калектыў бібліятэкі ў мінулым годзе зрабіў шмат для арганізацыі нармальнай работы чытальных залаў, дамовага абанемента і іншых аддзелаў, а таксама па перамяшчэнню і размеркаванню дапаможных фондаў у новым корпусе.

У 1963 годзе прадстаіць яшчэ большая работа па арганізацыі перамяшчэння фонда асноўнага кнігасховішча і расстаноўцы яго.

**Р. Г. ЛЮБІНА,**
загадчыца бібліятэкі БДУ.

**Ответы на кроссворд, опубликованный в предыдущем номере.**

1. Казахстан. 2. Уха. 3. Минск. 4. Икар. 5. Слой. 6. Стройка. 7. Трн. 8. Опера. 9. Код. 10. Стипендия. 11. Май.

# Будаўніцтва інтэрнатаў— пад неаслабны кантроль!

У лістападзе і снежні ў ходзе работ па ўзвядзенню інтэрнатаў па Кастрычніцкай вуліцы вызначыліся пэўныя здзвігі, хоць у цэлым план будаўніча-мантажных работ, устаноўлены генеральнаму падрадчыку, выконваецца нездавальняюча. Намнога невыканан план па асваенню грашовых сродкаў.

**На будаўніцтве першага інтэрната вядзецца цагляная кладка сцен, якая ўжо даведзена да адзнакі перакрыцця над першым паверхам. Цяпер укладаюцца панелі шматпустотнага насціла і пачнецца кладка сцен другога паверху. Неабходны фронт работ маецца для будаўнікоў, і яны павінны максімальна павялічыць тэмп будаўніцтва.**

**У канцы лістапада прадстаўлялася магчымасць прыступіць да работ на будаўніцтве другога інтэрната. Аднак будаўніцтва вядзецца тут вельмі марудна. Са 195 свай, прадугледжаных праектам, забіта да пачатку студзеня толькі 90.**

**Поўнасцю атрымана тэхнічная дакументацыя на будаўніцтва перахода і сталовай. Дакументацыя перадаецца будтрэсту № 1 і цяпер можна прыступіць да работ на ўсіх аб'ектах гарадка. Значыць, генпадрадчык — будтрэст № 1 мае ўсё неабходнае для таго, каб разгарнуць у поўным аб'ёме будаўнічыя работы на ўсім комплексе інтэрнатаў і сталовай.**

**Наша задача састаіць у тым, каб правядзеннем адпаведных арганізацыйных мерапрыемстваў і неаслабнага кантролю садзейнічаць своечасоваму выкананню плана будаўніча-мантажных работ і ўводу ў эксплуатацыю інтэрнатаў і сталовай у тэрмін.**

**М. К. ЗАНКЕВІЧ.**

**Пытанне-жарт**

Дзве сяброўкі Таня і Аня, сталі адна за адной. Таня наперадзе, Аня за Таней. Ці можа Таня адначасова стаяць за Аней?

*ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО..?*

*...Самы стары з нацыянальных сцягаў — дацкі? Гэты сцяг — белы крыж на чырвоным полі—устаноўлен у 1219 годзе.*

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА.

Адрас рэдакцыі: Мінск Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 05118. Зак. 114